Пролетары ўсіх краін, єднайцеся!

ВІЦЕБСКІ РАБОЧЫ

24 (7204)
сакавік
8
Чацвер
1945 г.

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА КАМІТЭТАЎ КП(б)Б, АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА СОВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Цана 20 кап.

Государственная библиотека СССР им. В. И. Ленина

Совецкія жанчыны з чэсцю выконваюць свой абавязак перад Радзімай, садзейнічаюць узмацненню ваеннай і эканамічнай магутнасці совецкай дзяржавы. Яны аказаліся дастойнымі сваіх бацькоў і сыноў, мужоў і братоў, якія адстаялі родную зямлю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

(З пастановы ЦК ВКП(б) „Аб Міжнародным жаночым дні—8 сакавіка").

Аб Міжнародным жаночым дні—8 сакавіка

Пастанова ЦК ВКП(б)

Міжнародны жаночы дзень—8 сакавіка жанчыны Совецкага Саюза адзначаюць у гэтым годзе ў абстаноўцы новых вялікіх перамог Чырвонай Арміі. Совецкія войскі выгналі нямецкіх парабашчальнікаў з нашай зямлі і зараз громяць ворага на тэрыторыі Германіі.

Совецкія жанчыны сваёй самаадданай працай дапамагаюць Чырвонай Арміі ў заваяванні гістарычных перамог над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Слаўныя дочкі нашай Радзімы—работніцы і калгасніцы, інжынеры і тэхнікі, аграномы і заатэхнікі, работнікі навукі і мастацтва, урачы і настаўніцы, работніцы совецкіх устаноў—у дні Вялікай Айчыннай вайны аддаюць усе свае сілы і веды справе перамогі над ворагам. Совецкія жанчыны, замяніўшы на вытворчасці сваіх мужоў, бацькоў, сыноў і братоў, на справе даказалі сваю гатоўнасць і здольнасць авалодваць прафесіямі, якія здаўна лічыліся мужчынскімі, і выносяць асноўны цяжар працы на фабрыках і заводах, у калгасах і соўгасах.

Совецкія жанчыны-работніцы з'яўляюцца вялікай сілай нашай соцыялістычнай прамысловасці. На ваенных заводах, электрастанцыях, нафтавых промыслах, на чыгуначным і рачным транспарце жанчыны і дзяўчаты праяўляюць доблесць і геройства ў працы, забяспечваючы Чырвоную Армію ўсё ўзрастаючай колькасцю ўзбраення і боепрыпасаў.

Жанчыны - калгасніцы з'яўляюцца галоўнай сілай у сельскай гаспадарцы. Чырвоная Армія на ўсім працягу вайны не адчувае недастатку ў прадуктах харчавання, і ў гэтым велізарная заслуга калгасніц нашай краіны. Сваёй гераічнай працай мільёны жанчын-калгасніц дапамагаюць забяспечваць фронт і тыл прадавольствам, а прамысловасць сыравінай.

Жанчыны вызваленых ад ворага раёнаў з кожным днём павялічваюць дапамогу сваёй вызваліцельніцы—Чырвонай Арміі, аддана працуюць над аднаўленнем гарадоў і сёл, гаспадаркі і культурных устаноў, разбураных нямецкімі захопнікамі.

Совецкія жанчыны-маці вырасцілі доблесных воінаў, якія прайшлі баявы гістарычны шлях ад Сталінграда да подступаў Берліна. Совецкая дзяржава славіць жанчын-мацярэй, якія выхавалі сваіх сыноў храбрымі і бясстрашнымі воінамі. Устанаўленне звання „Мать-героиня", ордэна „Материнская слава" і „Медали материнства" яшчэ вышэй падняла ў СССР ганаровую ролю маці. Жанчыны-маці выхоўваюць падрастаючае пакаленне ў духу адданасці Радзіме і любві да ведаў і працы.

Дзесяткі тысяч жанчын узялі на выхаванне дзяцей, якія страцілі сваіх бацькоў у час вайны, і акружылі іх мацярынскай ласкай. Неацэнімую дапамогу аказвае совецкая жанчына ў доглядзе за раненымі і выздараўліваючымі воінамі Чырвонай Арміі. Тысячы жанчын-донараў даюць сваю кроў для выратавання жыццяў франтавікоў.

Совецкія жанчыны з чэсцю выконваюць свой абавязак перад Радзімай, садзейнічаюць умацаванню ваеннай і эканамічнай магутнасці совецкай дзяржавы. Яны аказаліся дастойнымі сваіх бацькоў і сыноў, мужоў і братоў, якія адстаялі родную зямлю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

На франтах Айчыннай вайны многія совецкія жанчыны са зброяй у руках па-геройску змагаюцца з ворагам. Сярод сувязістаў, снайпераў, зенітчыкаў, лётчыкаў нямала жанчын—майстраў ваеннай справы. Савітаркі, медыцынскія сёстры, урачы выратоўваюць жыццё раненых байцоў і афіцэраў. Тысячы жанчын-франтавікоў узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Лепшыя з іх удастоены высокага звання Героя Совецкага Саюза.

Працоўная і воінская доблесць совецкай жанчыны, яе стойкасць, баявы дух, уменне мужна пераадольваць усе цяжкасці вайны маюць сваёй крыніцай гарачы, совецкі патрыятызм, глыбокую адданасць і вернасць совецкай Радзіме. У Айчыннай вайне совецкія жанчыны абараняюць сваю родную ўладу, якая дала ім свабоду, усе палітычныя правы, магчымасці для творчай працы і шчаслівага мацярынства.

Нямецкія варвары хацелі адняць у совецкіх жанчын свабоднае жыццё, ператварыць іх у пакорных і паслухмяных рабынь. Чырвоная Армія выратавала народы Совецкага Саюза ад нямецка-фашысцкага рабства. Слаўныя совецкія патрыёткі плячом к пляччу са сваімі муж'ямі, сынамі і братамі адстаялі свабоду і незалежнасць сваёй соцыялістычнай Радзімы.

Дні гітлераўскага крывавага рэжыму злічаны. Але на шляху да поўнай перамогі Чырвонай Арміі і арміям нашых саюзнікаў прыдзецца пераадольваць яшчэ жорсткае супраціўленне асуджанага ворага. Ад совецкіх жанчын, як і ад усяго совецкага народа, патрабуецца новае напружанне ўсіх сіл.

ЦК ВКП(б) абавязвае ўсе партыйныя арганізацыі правесці Міжнародны жаночы дзень—8 сакавіка як масавую палітычную кампанію, накіраваную на далейшае ўзмацненне дапамогі Чырвонай Арміі для хутчэйшага і канчатковага разгрому гітлераўскай Германіі, на ўмацаванне ваеннай і эканамічнай магутнасці совецкай дзяржавы. Партыйныя арганізацыі абавязаны растлумачыць усім працоўным жанчынам, што для канчатковага разгрому ворага кожная жанчына і дзяўчына нашай краіны, як і ўвесь совецкі народ, павінны працаваць яшчэ больш упарта, з дня ў дзень павялічваючы выпуск узбраення, боепрыпасаў і снаражэння для фронта, прадавольства для арміі і краіны, сыравіны для прамысловасці.

Партыйныя, совецкія, профсаюзныя і камсамольскія арганізацыі павінны праяўляць паўсядзённыя клопаты аб вытворчым навучанні і палітычным выхаванні працоўных жанчын, вылучаць перадавых жанчын на кіруючую работу ў совецкія, гаспадарчыя і грамадскія арганізацыі. Неабходна ўсямерна ўзмацніць увагу да бытавых патрэб жанчын, занятых у народнай гаспадарцы, акружаць жанчын-мацярэй пастаяннымі клопатамі.

Жанчыны—работніцы, інжынеры і тэхнікі! Давайце Чырвонай Арміі ўсё больш танкаў, самалётаў, гармат, мінамётаў, кулямётаў, аўтаматаў, боепрыпасаў!

Жанчыны — калгасніцы, работніцы МТС і соўгасаў, спецыялісты сельскай гаспадаркі! Упорнай працай забяспечвайце паспяховае выкананне плана сельскагаспадарчых работ на 1945 год — важнейшай ваенна-гаспадарчай задачы! Давайце фронту і краіне больш прадавольства і сыравіны!

Жанчыны - чыгуначніцы! Самаадданай і чоткай работай на транспарце дапамагайце Чырвонай Арміі дабіваць ворага!

Жанчыны — работнікі навукі і культуры, інжынеры, аграномы і ўрачы, работніцы совецкіх устаноў! Рухайце ўперад совецкую навуку, тэхніку і культуру!

Жанчыны—работнікі народнай асветы! Усе сілы, веды і вопыт аддавайце справе народнай асветы!

Жанчыны—зенітчыцы, снайперы, лётчыцы, сувязісткі! Настойліва павышайце сваё баявое майстэрства, бязлітасна знішчайце нямецкіх ізвергаў!

Жанчыны—урачы, фельчары, медыцынскія сёстры, санітаркі! Самаадданна змагайцеся за выратаванне жыцця і зварот у строй раненых совецкіх воінаў!

Совецкія жанчыны і дзяўчаты! У дасканаласці авалодвайце вытворчымі спецыяльнасцямі, нястомна павышайце прадукцыйнасць працы! Вывучайце ваенную справу! Усе сілы на разгром ворага, на далейшы пад'ём народнай гаспадаркі!

Прывітанне жанчынам свабодалюбівых народаў, якія змагаюцца супроць нямецкага імперыялізма! Усе сілы і баявую магутнасць аб'яднаных нацый на канчатковы разгром гітлераўскай Германіі! Забяспечым трывалы мір паміж народамі ўсяго свету.

Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў) вітае ўсіх працоўных жанчын Совецкага Саюза ў Міжнародны жаночы дзень—8 сакавіка і выказвае цвёрдую упэўненасць у тым, што совецкія жанчыны новымі подвігамі ў тылу і на фронце прыблізяць час нашай поўнай перамогі над ворагам.

Цэнтральны Камітэт
Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў).

Ад Совецкага Інформбюро

Аператыўная зводка за 7 сакавіка

Войскі 2-га Беларускага фронта 7 сакавіка з боем авалодалі гарадамі Гнеў (Меве), Старагард (Прэйсіш Старгард) — важнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў на подступах да Данцыга, а таксама з баямі занялі больш 200 другіх населеных пунктаў, сярод якіх буйныя населеныя пункты Заабен, Піншын, Гох Шцюбляу, Кошмін, Погуткен, Лінева, Ольпух, Дзімянен, Зомін, Рэкаў, Лубен, Трэблін, Барцін, Цолбрук, Альт-Беверсдорф, Альт-Шлавін, Дамсхаген, Нойвасэр.

Войскі 1-га Беларускага фронта, прадаўжаючы наступленне, 7 сакавіка штурмам авалодалі гарадамі Голноў, Штэпеніт і Масоў—важнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў на подступах да Штэтціна, а таксама з баямі занялі больш 50 другіх населеных пунктаў і сярод іх Вальддзівеноў, Фрытцоў, Яссоў, Лаатцыг, Загер, Паульсдорф, Шутцэндорф, Амаліенхоф.

Войскі фронта завяршылі ліквідацыю акружанай групіроўкі праціўніка на поўдзень ад горада Шыфельбайн. Па папярэдніх даных, у гэтым раёне ўзята ў палон больш 8.000 нямецкіх салдат і афіцэраў і захоплена вялікая колькасць узбраення і ваеннай маёмасці. У ліку палонных камандзір 10 нямецкага армейскага корпуса генерал-лейтэнант Краппе, разам са сваім штабам.

Войскі 2-га Украінскага фронта, пераадольваючы супраціўленне праціўніка, у цяжкіх умовах горна-лясістай мясцовасці ў раёне Карпат, 7 сакавіка авалодалі на тэрыторыі Чэхаславакіі горадам Банска Шцяўніца—моцным апорным пунктам абароны немцаў, а таксама з баямі занялі населеныя пункты Саса, Бабіна, Колпахі, Годруша, Гвоздніца.

У Венгрыі, на паўночны-ўсход і поўдзень ад возера Балатон, атакі буйных сіл пяхоты і танкаў праціўніка адбіваліся нашымі войскамі.

На другіх участках фронта—пошукі разведчыкаў і ў радзе пунктаў баі мясцовага значэння.

За 6 сакавіка на ўсіх франтах падбіта і знішчана 149 нямецкіх танкаў. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 29 самалётаў праціўніка.

* * *

Войскі 2-га Беларускага фронта прадаўжалі наступленне. Совецкія часці пад агнём праціўніка пераправіліся праз разлішуюся раку Ферзе і пасля жорсткіх баёў авалодалі горадам Гнеў (Меве)—важным апорным пунктам абароны немцаў у ніжнім цячэнні ракі Віслы. Другія нашы часці, прасунуўшыся ўперад на 10 кіламетраў, выбілі немцаў з горада Старагард (Прэйсіш Старгард) —апорнага пункта варожай абароны на подступах да Данцыга. Старагард з'яўляецца важным вузлом шляхоў зносін. Да яго выходзяць чатыры чыгункі. Совецкія пехацінцы і танкісты з баямі прасоўваючыся ўперад, на паўночны-захад ад Старагарда, занялі буйны населены пункт Лівева, які знаходзіцца ў 40 кіламетрах ад Данцыга. Адступаючы пад ударамі нашых войск праціўнік нясе цяжкія страты. На працягу дня войскамі фронта захоплены трафеі, у ліку якіх 44 гарматы, 80 мінамётаў, 14 чыгуначных эшалонаў і 500 аўтамашын.

* * *

Войскі 1-га Беларускага фронта развівалі паспяховае наступленне. Совецкія часці, якія занялі ўчора горад Камін, сёння нанеслі ўдар на паўночным напрамку і занялі населены пункт Вальддзівеноў, на ўзбярэжжы Балтыйскага мора. Другія нашы часці, на шырокім фронце, выйшлі на ўсходні бераг праліва Дзівенаў і Штэтцінскай гавані. Совецкія танкі і пяхота, прасунуўшыся ўперад на 15 кіламетраў, выйшлі да горада Голноў—важнаму апорнаму пункту немцаў, які прыкрываў подступы да горада Штэтцін. Праціўнік, імкнучыся ўтрымаць плацдарм на ўсходнім беразе Одэра, упорна супраціўляўся. На акраінах горада немцы закапалі ў зямлю танкі і скарысталі іх як агнявыя точкі. Нашы войскі пайшлі на штурм, зламалі варожае супраціўленне і авалодалі горадам Голноў. Совецкімі часцямі заняты гарады Масаў і Штэпеніт.

Нашымі войскамі ліквідавана групіроўка праціўніка, акружаная на поўдзень ад горада Шыфельбайн. Нямецкія часці, якія папалі ў „кацёл", прадпрымалі адчайныя спробы прарваць кальцо совецкіх войск. Асабліва жорсткія баі адбыліся ў раёне дарог, якія вядуць на захад. Імклівымі ўдарамі з усіх бакоў нашы пехацінцы, танкісты і кавалерысты расчлянілі нямецкія войскі на ізаляваныя друг ад друга групы. Часці Польскага войска за дзень знішчылі звыш 1.500 гітлераўцаў. Нашы кавалерысты знішчылі 1.200 нямецкіх салдат і афіцэраў. Совецкія танкісты ў баях за ліквідацыю акружанай групіроўкі праціўніка знішчылі да 4 тысяч гітлераўцаў. Раён баёў усеян разбітай тэхнікай, узбраеннем і трупамі салдат і афіцэраў. Нашы войскі ўзялі багатыя трафеі. Толькі на адным участку байцамі Н-скага злучэння захоплена ў немцаў 28 танкаў і самаходных гармат, 167 палявых гармат, 54 мінамёты, каля 700 грузавых і легкавых аўтамашын, 800 павозак і 2 тысячы коней.

* * *

Войскі 2-га Украінскага фронта, з баямі прасоўваючыся ўперад, выйшлі на подступы да горада Банска Шцяўніца. Імкнучыся аднавіць становішча, нямецкая пяхота, узмоцненая самаходнымі гарматамі, прадпрыняла контратаку. У выніку ўпорнага бою совецкія часці апракінулі гітлераўцаў і на плячах адступаючага праціўніка ўварваліся ў горад з поўдня і паўднёвага-ўсхода. Усю ноч ішлі моцныя баі. Сёння нашы войскі разграмілі варожы гарнізон і авалодалі горадам Банска Шцяўніца—вузлом шасейных дарог і моцным апорным пунктам абароны немцаў у раёне Карпат.

* * *

У Венгрыі, на паўночны-ўсход і поўдзень ад возера Балатон праціўнік з самай раніцы, пасля моцнай артылерыйскай падрыхтоўкі атакаваў нашы пазіцыі. На адным участку немцы кінулі ў бой буйныя сілы пяхоты, а таксама танкі і бронетранспарцёры з аўтаматчыкамі. Бой з самага пачатку прыняў напружаны характар. Совецкія пехацінцы і артылерысты, адбіваючы варожыя атакі, нанеслі немцам вялікія страты. На працягу дня знішчана звыш тысячы гітлераўцаў, спалена і падбіта 52 танкі і самаходных гармат праціўніка.

* * *

Авіяцыя Чырвонасцяжнага Балтыйскага флота, у выніку бомбаваштурмавога ўдара патапіла тры нямецкіх транспарты. Апрача таго аднаму транспарту і эсмінцу праціўніка нанесены сур'ёзныя пашкоджанні. Агнём берагавых артылерыйскіх батарэй патоплен нямецкі катэр.

Следваць прыкладу перадавых МТС

Наша краіна рыхтуецца да веснавой сяўбы. Калгаснае сялянства, работнікі МТС, натхнёныя вялікімі перамогамі Чырвонай Арміі і гістарычным загадам таварыша Сталіна ад 23 лютага, рыхтуюць дастойную сустрэчу веснавой сяўбе, змагаюцца, каб у сёлетнім годзе вырасціць высокі ўраджай.

Кожнаму вядома, што поспех у барацьбе за атрыманне высокіх ураджаяў залежыць ад усебаковай падрыхтоўкі да веснавых работ. Добра падрыхтавацца да сяўбы, правесці яе ў сціслыя, вызначаныя тэрміны —значыць закласці моцную аснову багатага ўраджаю. Велізарнейшае значэнне ў правядзенні веснавой сяўбы мае добра падрыхтаваны трактарны парк. Высокаякасны рамонт трактараў—адно з галоўных звенняў, забяспечваючых атрыманне высокага ўраджаю—ураджаю перамогі.

Перадавыя МТС нашай вобласці, разгортваючы соцыялістычнае спаборніцтва на рамонце трактараў, дабіліся выдатных вынікаў. Так, калектыў Мазалаўскай МТС закончыў рамонт трактарнага парка, у тым ліку капітальна адрамантаваў 12 трактараў. Тут кіраўнікі МТС сумелі арганізаваць працу так, што іх МТС на рамонце выйшла ў лік перадавых.

Сёння мы друкуем пастанову выканкома Віцебскага облсовета і бюро абкома КП(б)Б аб уручэнні пераходнага Чырвонага Сцяга і грашовых прэмій выканкома облсовета і абкома КП(б)Б. Пераходны Чырвоны Сцяг і грашовая прэмія ў суме 3.000 рублёў уручана Мазалаўскай МТС, Віцебскага раёна. Калектыў работнікаў Мазалаўскай машынна-трактарнай станцыі сваёй самаадданай працай заваяваў ганаровае права на атрыманне пераходнага Чырвонага Сцяга, высокаякасна выканаўшы план рамонту трактарнага парка. І няма сумнення, што работнікі гэтай МТС і надалей пакажуць узоры стаханаўскай працы і будуць моцна трымаць першынства ў спаборніцтве.

За датэрміновае і якаснае выкананне рамонту трактараў выканком облсовета дэпутатаў працоўных і бюро абкома КП(б)Б рашылі выдаць грашовую прэмію ў суме 2.000 рублёў Сялюцкай МТС, Віцебскага раёна. Адзначана таксама добрая работа па рамонту трактараў Суражскай і Задзвінскай МТС, Суражскага раёна, Чашніцкай МТС, Старынаўскай МТС, Сіроцінскага раёна.

Але на вялікі жаль, у радзе МТС вобласці справа рамонту трактараў пушчана на самацёк. Бескатаўская МТС, напрыклад, рамонт трактараў выканала толькі на 50 процантаў. Не лепш абстаіць справа з рамонтам і ў Лёзненскай МТС. Кіраўнікі гэтых МТС, відаць, не разумеюць усёй палітычнай важнасці своечасовага рамонту трактарнага парка. Побач з гэтым, трэба адзначыць, што і райкомы КП(б)Б і райвыканкомы гэтых раёнаў недастаткова займаюцца рамонтам трактараў, не ўнікаюць у арганізацыю працы на рамонтных работах. Тут амаль зусім не вядзецца ніякай масава-палітычнай работы сярод трактарыстаў, занятых на рамонце.

Зварот калектыва Прапойскай МТС, Магілеўскай вобласці, да ўсіх трактарыстаў, рабочых і служачых машынна-трактарных станцый рэспублікі аб арганізацыі Усебеларускага соцыялістычнага спаборніцтва за лепшую падрыхтоўку і паспяховае правядзенне веснавой сяўбы, за ўзорнае выкананне ўсіх трактарных работ бягучага года знайшоў найшырэйшы водгук сярод трактарыстаў і ўсіх работнікаў МТС нашай вобласці. Так, у адказ на заклік прапойскіх трактарыстаў калектыў Першай Гарадоцкай МТС абавязаўся закончыць рамонт трактарнага парка і прычэпнага інвентару да 10 сакавіка, выпрацаваць на кожны 15-сільны трактар не менш 500 гектараў, зэканоміць 10 процантаў гаручага. Трактарная брыгада т. Быкава з гэтай МТС абавязалася выпрацаваць на кожны 15-сільны трактар не менш 800 гектараў і зэканоміць 12 процантаў гаручага ў 1945 годзе.

Рамонт трактараў—вялікая дзяржаўная справа. Таму нашы прамысловыя прадпрыемствы вобласці павінны аказаць максімальную дапамогу МТС у падрыхтоўцы трактарнага парка да веснавой сяўбы. Соўнаркам СССР і ЦК ВКП(б) у сваёй пастанове аб плане развіцця сельскай гаспадаркі на 1945 год абавязалі партыйныя і совецкія органы аказваць дапамогу МТС у правядзенні рамонту трактараў шляхам пасылкі з гарадоў рамонтных брыгад. Але трэба сказаць, што ў гэтым напрамку пакуль што амаль нічога не зроблена. А магчымасці ў аказанні дапамогі МТС прамысловымі прадпрыемствамі ў нас ёсць.

Усямернае павышэнне ўраджайнасці, павышэнне культуры земляробства і якасці ўсіх сельскагаспадарчых работ—ганаровая і галоўная задача кожнага кіраўніка калгаса, МТС, зямельных органаў, совецкіх і партыйных арганізацый.

Разгортваючы Усебеларускае соцыялістычнае спаборніцтва за выдатную работу МТС, трэба справу паставіць так, каб паспяхова падрыхтавацца і правесці веснавую сяўбу і ўсе сельскагаспадарчыя работы, усямерна палепшыць выкарыстанне машынна-трактарнага парка, павысіць якасць трактарных работ, дабівацца кожнай МТС выканання сваіх вытворчых абавязацельстваў перад калгасамі ў агратэхнічныя тэрміны.

Па - большэвіцку падрыхтуем трактарны парк да пачатку палявых работ.

У выканкоме абласнога Совета дэпутатаў працоўных і абкоме КП(б)Б

Выканком Віцебскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных і бюро абкома КП(б)Б, абмеркаваўшы пытанне аб уручэнні пераходнага Чырвонага Сцяга і грашовых прэмій выканкома облсовета і абкома КП(б)Б, ПАСТАНАВІЛІ:

1. Уручыць Мазалаўскай машынна-трактарнай станцыі, Віцебскага раёна, пераходны Чырвоны Сцяг выканкома облсовета і абкома КП(б)Б і грашовую прэмію ў суме 3.000 рублёў за датэрміновае і высокаякаснае выкананне плана рамонту трактарнага парка.

2. За датэрміновае і якаснае выкананне рамонту трактараў выдаць грашовую прэмію ў суме 2.000 рублёў Сялюцкай МТС, Віцебскага раёна.

3. Адзначыць таксама добрую работу па рамонту трактараў Суражскай і Задзвінскай МТС, Суражскага раёна, Чашніцкай МТС, Чашніцкага раёна і Старынаўскай МТС, Сіроцінскага раёна.

ЖАНЧЫНЫ-ВУЧОНЫЯ

За час вайны вялікая колькасць жанчын нашай краіны атрымала вучоныя ступені і званні.

За 1942—1944 гг. Вышэйшая атэстацыйная камісія прысвоіла званне прафесара 45 жанчынам, дацэнта — 445 і старшага навуковага супрацоўніка—348.

За той-жа перыяд многія жанчыны-вучоныя абаранілі дысертацыі. Вышэйшая атэстацыйная камісія прысудзіла ступень доктара навук 79 жанчынам. Значная колькасць жанчын атрымала ступень кандыдата навук.

БОЛЬШ ТАВАРАЎ ШЫРОКАГА СПАЖЫВАННЯ ФРОНТУ І КРАІНЕ!

ЗВАРОТ

абласной нарады кіраўнікоў і стаханаўцаў прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці і прамысловай кааперацыі Віцебскай вобласці

да ўсіх рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў, служачых і кіраўнікоў прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці і прамысловай кааперацыі

Дарагія таварышы!

Наша нарада сабралася ў гістарычныя дні, калі ўся савецкая краіна святкуе 27-ю гадавіну Чырвонай Арміі, якая „...не толькі вызваліла родную зямлю ад гітлераўскай погані, але і адкінула ворага на многія сотні кіламетраў за тыя рубяжы, з якіх немцы па-разбойніцку напалі на нашу краіну, перанесла вайну на тэрыторыю Германіі і цяпер разам з арміямі саюзнікаў паспяхова давяршае справу разгрому нямецка-фашысцкай арміі" (І. Сталін).

З ваеннымі перамогамі Чырвонай Арміі пераклікаюцца працоўныя перамогі ў тыле. Мясцовая прамысловасць і прамысловая кааперацыя Віцебскай вобласці, працуючы ў 1944 годзе па аднаўленню разбураных немцамі прадпрыемстваў, змаглі арганізаваць 16 райпромкамбінатаў, якія налічваюць 159 прадпрыемстваў і стварыць 52 арцелі, якія ў прайшоўшым годзе выпусцілі тавараў шырокага спажывання на суму звыш 4-х мільёнаў рублёў.

Разам з гэтым мы не выканалі асноўных умоў Усебеларускага сацыялістычнага спаборніцтва работнікаў мясцовай прамысловасці і промкааперацыі. Прадпрыемствамі нашай вобласці не выконваецца план выпуску тавараў шырокага спажывання ў асартыментным разрэзе. Марудна асвойваюцца новыя віды прадукцыі з мясцовай сыравіны. Якасць выпускаемых тавараў і прадукцыйнасць працы стаяць на нізкім узроўні. Нездавальняюча праводзіцца падрыхтоўка новых кадраў і работа па павышэнню кваліфікацыі вытворчых рабочых.

Мала было ўдзелена ўвагі развіццю харчовай прамысловасці, збору і пераапрацоўцы дзікарастучых і здабычы рыбы. Адсутнасць дагавораў з гандлёвымі арганізацыямі перашкаджала ўстанаўленню належнага кантролю за ходам вытворчасці.

Абласная нарада кіраўнікоў і стаханаўцаў прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці, прамысловай і спажывецкай кааперацыі заклікае ўсіх рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых:

1. Выканаць вытворчы план 1945 г. па промкамбінатах, арцелях і прадпрыемствах да 28-й гадавіны Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі.

2. Змагацца за расшырэнне новых вытворчасцей на базе мясцовай сыравіны. Павялічыць выпуск тавараў хатняга ўжытку, будаўнічых матэрыялаў. Адкрыць цэхі па выпуску культтавараў, вучэбных, наглядных дапаможнікаў, цацак, вучнёўскіх лінеек, піналаў, крэйды, грыфеляў, галантэрыі з косці, рагоў і капытоў, мастацкую роспіс, каўровыя ткацтвы, вырабы з смалы, спатры, арганізаваць выраб прылад лову рыбы з мясцовай сыравіны і рад іншых промыслаў, прадукцыя якіх з'яўляецца вельмі дэфіцытнай і вельмі важнай для насельніцтва.

3. Узмацніць работу па збору і пераапрацоўцы дзікарастучых: нарыхтаваць і пераапрацаваць у 1945 г. 300 тон грыбоў марынаваных, 12 тон сухіх грыбоў, 400 тон ягад, пераапрацаваць 100 тон рыбы.

4. Дабіцца ў 1945 г. улову рыбы сістэмамі мясцовай прамысловасці і промкааперацыяй у колькасці 3.000 цэнтнераў, Дзяржрыбтрэсту — 7.000 цэнтнераў, облспажыўсаюзу — 2.000 цэнтнераў.

5. Павялічыць прадукцыйнасць працы на 5 процантаў, гэтым самым знізіць сабекошт прадукцыі на 10 процантаў.

6. Палепшыць якасць выпускаемай прадукцыі.

7. Арганізаваць падрыхтоўку кадраў на прадпрыемствах, падрыхтаваўшы да канца 1945 г. па облмясцпрому 800 чалавек кваліфікаваных рабочых, многапромсаюзу—600 чалавек, каапінсаюзу—300 чалавек, горпромсаюзу — 300 чалавек, лесдрэўхімсаюзу--300 чалавек, облспажыўсаюзу—300 чалавек. Для павышэння кваліфікацыі вытворчых рабочых праводзіць семінары з рабочымі.

8. Арганізаваць пры кожным гаррайпромкамбінаце, кожнай арцелі аддзелы тэхнічнага кантролю. У кожным асобным выпадку рабіць маркіроўку тавараў.

9. У майстэрнях бытавога абслугоўвання ўзмацніць увагу і клопаты да заказчыкаў і спажыўцоў.

10. Практыкаваць запрашэнне спецыялістаў з усходніх абласцей для арганізацыі новых вытворчасцей і абучэнне кадраў, а таксама пасылку сваіх спецыялістаў для абмену вопытам работы.

11. Да 15 сакавіка заключыць дагаворы з гандлюючымі арганізацыямі на рэалізацыю прадукцыі.

Абласная нарада ўпэўнена, што калектыў работнікаў мясцовай прамысловасці, прамысловай кааперацыі і спажыўкааперацыі Віцебскай вобласці, разгарнуўшы яшчэ шырэй Усебеларускае сацыялістычнае спаборніцтва, стаханаўскі рух, дабіецца вялікіх поспехаў у аднаўленні і развіцці мясцовай прамысловасці, прамысловай кааперацыі і спажыўкааперацыі.

Таварышы! Набліжаецца час поўнага разгрому гітлераўскіх разбойнікаў, час, якога з нецярпеннем чакаюць працоўныя нашага неабсяжнага Савецкага Саюза і ўсе вызваленыя народы свету.

Самаадданай працай у тылу, у прамысловасці, на чыгуначным транспарце і ў сельскай гаспадарцы дапаможам Чырвонай Арміі хутчэй разграміць ворага, прыблізіць час поўнай перамогі.

Няхай жыве партыя большэвікоў!

Няхай жыве наша слаўная Чырвоная Армія і яе палкаводзец, Вярхоўны Галоўнакамандуючы Маршал Совецкага Саюза—геній чалавецтва, наш родны Сталін!

Прынята на абласной нарадзе кіраўнікоў і стаханаўцаў прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці і прамысловай кааперацыі Віцебскай вобласці.

У імя чэсці і незалежнасці Радзімы совецкія жанчыны, юнакі і дзяўчаты праяўляюць доблесць і гераізм на фронце працы.
(І. СТАЛІН).

Машыніст Сіменьчукова

7 год працуе Таня Сіменьчукова на Віцебскім чыгуначным вузле. Ад некваліфікаванай работніцы да машыніста манеўровага паравоза—такі шлях маладой камсамолкі за час работы на транспарце.

У 1941 годзе, пасля вучобы на курсах машыністаў, Таня пачала самастойна вадзіць паязды. Калі гітлераўскія мярзотнікі акупіравалі тэрыторыю Беларускай ССР машыніста Сіменьчукову перавялі на Паўночную чыгунку. Там яна шчыра і адданна працавала на карысць Радзімы, але думка аб родным Віцебскім дэпо, дзе яна вырасла і выхавалася не пакідала яе. І як толькі доблесныя часці Чырвонай Арміі пачалі вызваляць тэрыторыю Заходняй чыгункі, камсамолка Сіменьчукова дабілася пераводу на ўчастак Масква—Смаленск.

У 1943 годзе, у дні летняга наступлення Чырвонай Арміі, Таня—на франтавой паласе машыністам. Ёй не страшны былі варожыя снарады і самалёты. Разам з байцамі яна наступала на фашысцкія пазіцыі жывую сілу і магутную тэхніку для разгрому ворага.

Зараз Таня працуе ў Віцебскім дэпо. Яе маняўровы паравоз „Щ—819" заўсёды ўтрымліваецца ў тэхнічна-культурным і спраўным стане. Працуючы па метаду Карабкова, камсамолка Сіменьчукова дабілася штомесячнай эканоміі паліва, перавыкананне ўсіх заданых вымяральнікаў. Пры норме 3.600 кіламетраў міжпрамывачны прабег яе паравоза дасягае 4.320.

В. Іваноў.

Баявыя падругі

Ix служба Арміі, Радзіме пачалася з дня зараджэння атрада.

Гэта было вясною 1943 года. На ўчастак нашага фронта, які праходзіў недалёка ад Усць-Таропы, Калінінскай вобласці, Наркамрэчфлотам быў прыслан невялікі атрад воднікаў. Перад атрадам была пастаўлена задача адрамантаваць рад баявых катэраў, захопленых у праціўніка, і забяспечыць падвоз па раце Заходняя Дзвіна боепрыпасаў для арміі.

У разгар гарачых і напружаных работ да начальніка атрада прышлі дзве дзяўчыны, якія расказалі аб сваім жаданні дапамагчы Чырвонай Арміі біць немца і прасілі залічыць іх байцамі атрада.

Так пачалося баявое жыццё дзвюх падруг: былой калгаснай трактарысткі Насці Андрэевай і былой вучаніцы 6-га класа сельскай школы Нюры Львовай.

Асвойваць складаную прафесію суднавадзіцеля, вывучаць матор, фарватар ракі і набываць іншыя неабходныя веды прышлося ў працэсе работы.

Работы было многа, небяспечнай і цяжкай. Выконваючы баявое заданне па дастаўцы фронту боепрыпасаў або іншых ваенных матэрыялаў, штомінутна прыходзілася рызыкаваць жыццём і глядзець смерці ў вочы.

Аднойчы дзяўчаты, выконваючы загад камандавання, вышлі ў самастойны рэйс на газаходзе № 14, які быў адрамантаван імі ўласнымі сіламі. Насця была матарыстам, Нюра—яе памочнікам і шураўшчыком. Раён плавання і фарватар ракі, дзе прышлося плысці, не былі знаёмы. На адным з паваротаў хуткім цячэннем разарвала буксіруемы плыт і выкінула на камені, адкуль зняць яго здавалася немагчымым. Але дзяўчаты ведалі, што загад камандавання павінен быць выканан. Пачалася цяжкая, амаль непасільная для іх барацьба за выратаванне плыту і грузу на ім. „Намаганні былі прыкладзены неймаверные,—успамінае аб гэтым зараз Насця,—але плыт быў намі выратаван і дастаўлен фронту".

1944 год. Чырвоная Армія, няспынна праследуючы ворага, рухалася ўсё далей і далей на захад. Услед за арміяй, аж да Дзвінска, рухаліся на сваім катэры дзяўчаты, бесперабойна снабжаючы фронт боепрыпасамі, дастаўляючы рэзервы і іншыя ваенныя грузы.

За выкананне баявых заданняў адважныя матарысткі прадстаўлены да ўрадавай узнагароды.

Зараз баявыя падругі рыхтуюць свой газаход да плавання на вызваленай рацэ. З 7-мі комсамольска-маладзёжных брыгад па рамонту маторaў, брыгада Насці і Нюры займаюць другое месца. Іх матор сабран і працуе безадказна.

Дзяўчаты рыхтуюцца ўступіць у рады членаў ВЛКСМ і ўйсці ў плаванне на комсамольскім катэры.

„Уступленне ў комсамол,—гаворыць Нюра,—абавязвае нас працаваць яшчэ лепш, яшчэ самаадданей, не шкадуючы ні сіл, ні энергіі для нашай любімай Радзімы.

М. Славіна.

Патрыятычны подвіг Багрэцовай

У лістападзе мінулага года Марыя Андрыянаўна Багрэцова атрымала пісьмо. Генерал-маёр авіяцыі тав. Сінельнікаў пісаў:

— У цяжкія ліпеньскія дні 1941 года ў імя свабоды і незалежнасці нашай Радзімы Вы зрабілі патрыятычны паступак. Не лічачыся з цяжкасцямі і небяспекай для свайго жыцця і жыцця вашых блізкіх, Вы выратавалі жыццё совецкага лётчыка маёра Сергея Алексеевіча Ульяноўскага. Ваш самаадданы паступак і мацярынскія клопаты не прапалі дарэмна. Сергей Алексеевіч Ульяноўскі—зараз палкоўнік, знаходзіцца на кіруючай пасадзе ў авіяцыі дальняга дзеяння і прымае непасрэдны ўдзел у знішчэнні фашысцкіх захопнікаў на іх уласнай зямлі. Кіруемая ім плеяда адважных сталінскіх сокалаў наносіць магутныя бомбавыя ўдары па логаву фашысцкага звера.

Камандаванне авіяцыі дальняга дзеяння высока ацаніла Вашу заслугу перад Радзімай і ў дзень 27-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэволюцыі ад імені Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР узнагародзіла Вас баявым ордэнам Чырвоная Звязда.

Прачытаўшы пісьмо, Марыя Андрыянаўна стала прыпамінаць усё, што адбылося за годы фашысцкай акупацыі.

...Ліпеньскія дні 1941 года. Нямецкая салдатня шэрыць па хатах калгаснікаў... Над вёскай разыграўся паветраны бой. О! Як страшэна! фашысцкія сцервятнікі збілі наш совецкі самалёт. Вялізны, палыхаючы полымем, ён упаў на зямлю. А метраў у 800 ад вёскі на парашуце прызямліўся лётчык. Яго падабралі свае людзі. Пасечанага асколкамі, абгарэўшага, з прастрэлянай нагой я ўзяла яго да сябе. У сараі зрабіла патайную пасцель і там палажыла раненага, каб не знайшлі немцы. Я вельмі баялася іх. І так 7 месяцаў лячыла яго, даглядала як за сваім родным сынам. Я так абласкала яго і ўшанавала, што мой хворы, Сергей Алексеевіч, стаў называць мяне маці і неяк сказаў:

— Ведаеш, мамаша! Як выздараўлю і перабяруся праз лінію фронта да сваіх, то абавязкова прыду разам з воінамі Чырвонай Арміі вас вызваляць ад фашысцкага рабства. Вашу мацярынскую любоў да мяне і ўвагу я ніколі не забуду...

Мой пітомец паступова папраўляўся. І калі загаіліся раны, цёпла развітаўшыся са мной, ён пайшоў да сваіх. Адыходзячы сказаў:

— Мы адпомсцім немцам за ўсе вашы пакуты і гора. Мы абавязкова з вамі, мамаша, сустрэнемся.

У гэтую сустрэчу я верыла. Чула маё мацярынскае сэрца, што не здабраваць чужынцам на нашай зямлі...

А колькі гора і пакут я прыняла? Праклятыя немцы спалілі маю хату, разграбілі гаспадарку, а затым забралі майго мужа Дзем'яна Петровіча і расстралялі. Увесь час дапытваліся пра совецкага афіцэра. Не выдаў стары.

— Памёр, кажа, пахавалі афіцэра на могілках...

* * *

Праз некалькі дзён пасля таго, як Марыя Андрыянаўна атрымала пісьмо ад генерала, перад яе хатай застанавілася пад'ехаўшая аўтамашына. Разгубленая, усхваляваная, са слезамі радасці на вачах Марыя Андрыянаўна сустрэла Сергея Алексеевіча. Поўны сіл і баявога жыцця перад ёй прадставіўся палкоўнік авіяцыі дальняга дзеяння Сергей Алексеевіч Ульяноўскі, якому яна ў цяжкіх умовах фашысцкай акупацыі клапатліва аднаўляла сілы. Побач з палкоўнікам стаяў генерал. Ён уручыў Марыі Андрыянаўну высокую ўрадавую ўзнагароду—ордэн Чырвонай Звязды.

К. Матвіевіч.

Вёска Спаскае,
Сіроцінскага раёна.

Узорна падрыхтуемся да веснавой сяўбы!

У адказ на заклік прапойскіх трактарыстаў

Зварот калектыва Прапойскай МТС, Магілеўскай вобласці, знайшоў жывейшы водгук сярод трактарыстаў, рабочых і служачых Першай Гарадоцкай МТС. На нарадзе яны аднадушна рашылі ўключыцца ва Усебеларускае сацыялістычнае спаборніцтва машынна-трактарных станцый. Выступіўшы брыгадзір чацвертай брыгады тав. Быкаў сказаў:

— У мінулым годзе мая брыгада трымала пяршынства ў МТС па выкананню вытворчага плана. Паспяхова мы закончылі рамонт трактараў і прычэпнага інвентару. Дзяржаўная камісія дала ацэнку нашай работы «добра» і «выдатна». Падлічыўшы свае магчымасці, я абавязуюся захоўваць усе правілы тэхнічнага догляду за трактарамі, выпрацаваць на кожны 15-сільны трактар у 1945 годзе не менш 800 гектараў і зэканоміць 12 процантаў гаручага. Веснавую сяўбу ў замацаваных калгасах і брыгадах правядзем у лепшыя агратэхнічныя тэрміны і высакаякасна.

Усе трактарысты горача падтрымалі тав. Быкава. Калектыў МТС абавязаўся поўнасцю закончыць рамонт трактарнага парка і прычэпнага інвентару да 10 сакавіка, выпрацаваць на кожны 15-сільны трактар не менш 500 гектараў, зэканоміць 10 процантаў гаручага.

П. Дземеншчонак,
сакратар партарганізацыі МТС.

Конны інвентар--у баявую гатоўнасць

Шырока абмяркоўваючы пастанову Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) аб плане развіцця сельскай гаспадаркі на 1945 год, калгаснае сялянства яшчэ з большай энергіяй разгарнула падрыхтоўку да веснавой сяўбы. На аснове сацыялістычнага спаборніцтва перадавыя калгасы нашай вобласці дасягнулі значных поспехаў у рабоце. Члены сельгасарцелі імені Молатава, Шумнянскага сельсовета, Віцебскага раёна, поўнасцю засыпалі і ачысцілі насенны фонд, праверылі яго на ўсходжасць, закончылі рамонт інвентару. У поўным парадку знаходзіцца адрамантаваны інвентар у калгасе імені Дзяржынскага, Мехаўскага раёна. Тут у дастатковай колькасці падрыхтавалі аралейных хамутоў, гужоў, лейцаў.

Аднак у радзе калгасаў вобласці рамонт інвентару ідзе недапушчальна марудзімі тэмпамі. Па Гарадоцкаму раёну адрамантавана толькі 700 плугоў з патрэбных 1.460, не адрамантавана 550 боран, 160 калёс. У калгасах раёна налічваецца 36 кузняў, але іх работай ніхто не займаецца. У выніку амаль палова іх дняміпростойвае з-за адсутнасці вугалю.

У калгасе імені Калініна гэтага раёна з-за дрэннай работы кузні да гэтага часу адрамантавана толькі 8 плугоў з патрэбных 18, 9 боран замест 17, а да рамонту калёс і не думалі прыступаць. Старшыня калгаса тав. Нікаленка не цікавіцца падрыхтоўкай да веснавой сяўбы. Аналагічнае становішча з рамонтам інвентару ў калгасах „1-ы Май", Маскаленецкага сельсовета, „Ударнік", Селішчанскага сельсовета.

Не спяшаюцца з рамонтам коннага інвентару і ў Сіроцінскім раёне. На пытанне: як ідзе рамонт сельскагаспадарчага інвентару ў калгасах раёна? Намеснік старшыні раённага Совета дэпутатаў працоўных тав. Малахоўскі адказаў:

—Па малу рухаем..., думаем падняжаць на гэту справу.

Кіраўнікі раёна ўжо трэці месяц „падняжымаюць", а адрамантавана толькі 650 плугоў з патрэбных 1.870. У калгасах „Іскра", „518" і іншых Дабейскага сельсовета плугі і бораны раскіданы па дварах, метал на іх ржавее, а драўляныя часткі гніюць. У 6 кузнях гэтага сельсовета адрамантавана толькі каля 70 плугоў і 80 барон. Рамонт калёс нерадзівыя кіраўнікі адкладваюць да цёплых дзён.

Сакавік—рашаючы месяц у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Таму неабходна прыняць усе меры, каб у кожнай кузні быў наведзен узорны парадак і цвёрдая дысцыпліна, даведзці графік рамонту інвентару і арганізаваць штодзённы кантроль за яго выкананнем. Чым хутчэй і лепш будзе закончан рамонт сельскагаспадарчага інвентару, тым трывалей будзе закладзен фундамент будучага ўраджаю.

В. Егораў.

ДОБРЫ ПАЧЫН

Шэфствуюць над канём. Збіраюць мясцовыя ўгнаенні

Комсамольцы Багушэўскага раёна прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Комсамольская арганізацыя калгаса «Малая Чарніца», Замастоцкага сельсовета, узяла шэфства над канём.

Дзяўчаты комсамолкі Ганчарова Таццяна і Шугаева Надзежда на чале з сакратаром комсамольскай арганізацыі Пучковай Зінаідай арганізавалі штодзённую прамыўку шчолакам хворых каростай коней. Яны самі кантралююць кармленне коней і скарыстанне іх на рабоце.

Добры пачын Малачарніцкіх комсамольцаў падтрымалі комсамольцы калгасаў імені Будзённага, Буцкага сельсовета і «Большэвік», Машканскага сельсовета, якія таксама старанна даглядаюць за конямі, каб моцнымі падрыхтаваць іх да вясенне-палявых работ.

У падрыхтоўку да веснавой сяўбы таксама ўключыліся комсамольцы мясцовай прамысловасці. Так, комсамольцы спіртзавода сабралі тры тоны попелу і перадалі яго свайму падшэфнаму калгасу «Пяцігодка ў чатыры годы», Буцкага сельсовета. Апрача таго, яны абавязаліся здаць калгасу па 15 кілограмаў вярхушак клубняў бульбы кожны. Комсамольская арганізацыя гэтага калгаса (сакратар тав. А. К. Сухадолава), пранўляючы клопаты аб будучым ураджаі, таксама арганізавала збор мясцовых угнаенняў. Сіламі комсамольцаў ужо сабрана звыш 10 цэнтнераў попелу.

Ал. Шутаў.

Абласны агляд мастацкай самадзейнасці

Закончыўся абласны агляд мастацкай самадзейнасці. Тры дні прадстаўнікі раённых самадзейных калектываў—спявакі, танцоры, музыканты дэманстравалі сваё мастацтва. Перад глядачамі, змяняючы адзін аднаго, праходзілі таленавітыя, упаўне здольныя выканаўцы. Са сцэны гучэлі беларускія, рускія і украінскія песні. Праграма агляду была цікавай і рознастайнай.

Вось рабочыя Асінторфу выконваюць усім вядомую беларускую народную пляску Лявоніху. Усе выступаючыя аранууты ў нацыянальныя касцюмы. Удалае спалучэнне танца з музыкай і песняй прыводзіць прысутных у захапленне. А вось работніцы завода, дзе дырэктарам т. Зіноўеў, Аўсянніцкая і Ніфагіна ліха адплясваюць украінскі гапак. Танец змяняецца песняй, дэкламацыяй. Чыгуначнікі Віцебскага вузла з пад'ёмам выконваюць песні: „Вечер на рейде" і „Марш машинистов".

На сцэне хор Акцябрскага раёна. Маладыя рабочыя ў свой рэпертуар уключылі рад беларускіх і рускіх народных песень. Удала гучаць у іх выкананні песенкі: „Ты чырвоная каліна", „Тост" і „Франтавая барада".

З заслужаным поспехам прайшло выступленне ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці Сенненскага раёна. Пад кіраўніцтвам Любімцавай Галіны і акампанемент Латышавай Ніны на гармоні. Хоргор. Сянно выдатна выканаў народныя песні „Каліна", „Летят утки".

Высокую культуру выканання паказаў хор Лёзненскага раёна пад кіраўніцтвам Бондаравай Ф.

З няменшым поспехам на аглядзе прайшлі індывідуальныя выступленні. З захапленнем уся зала сачыла за выкананем складаных акрабатычных нумароў Зайцавай (калгас „Усход", Сенненскага раёна) і Сакаловай (Віцебск).

Слухаючы т. Луфера, які праспяваў лірычныя песні „Домик на юге", „Тихо в избушке" і т. Мельдзюкову, якая выканала песенку „Чилита", бачыш перад сабой здольных таленавітых спявакоў, якія з вялікім поспехам маглі-б выступаць на эстрадзе.

На аглядзе было шырока прадстаўлена мастацкае чытанне. У ім прынялі ўдзел калгаснікі, рабочыя, совецкая інтэлігенцыя—людзі ўсіх узростаў і прафесій.

Пасля прагляду, у памяшканні Другога Беларускага Драматычнага тэатра імені Якуба Коласа адбыўся заключны канцэрт, дадзены ўдзельнікамі абласнога агляду мастацкай самадзейнасці. Камісія па правядзенню агляду падвяла вынікі праведзенай работы. 60 удзельнікаў узнагароджаны граматамі абласнога аддзела мастацтваў і абкома комсамола. 9 чалавек атрымалі індывідуальныя прэміі. Першых два месцы прысуджаны калектыву Асінторфу і хору Акцябрскага раёна. Гэтым калектывам выдадзены грашовыя ўзнагароды па 1.000 рублёў кожнаму.

Абласны агляд мастацкай самадзейнасці праходзіў упершыню пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі. Ён паказаў наколькі багаты наш народ талентамі, што імкненне да народнай творчасці і мастацтва ў ім не замірала нават у самыя цяжкія мінуты жыцця.

Значэнне прайшоўшага агляду мастацкай самадзейнасці вельмі вялікае. Наша таленавітая моладзь паказала, што гурткі самадзейнасці могуць дасягнуць выдатных поспехаў.

А. СТУК.

Ваенныя дзеянні ў Заходняй Еўропе

ЛОНДАН, 4 сакавіка. (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца, што войскі саюзнікаў занялі 4 нямецкіх гарады бліз Пюльхейма, прыкладна ў 6,5 кілометра ад прадмесця Кельна. Войскі саюзнікаў дасягнулі Пюльхейма і вядуць баі яшчэ ў 2 гарадах на паўночны-захад ад Кельна. На паўднёвы-захад ад Кельна саюзнікі захапілі 4 гарады. У калідоры паміж рэкамі Маас і Рэйн саюзнікі сустрэліся з упорным супраціўленнем нямецкіх войск на ўсход ад Гохвальскага лесу. Атрады саюзных войск, якія наступаюць з сектара ракі Рэр, і часці, якія прасоўваюцца на поўдзень ад Рэйхсвальда, устанавілі кантакт. У агульным выніку саюзнікі занялі 3 сакавіка 24 гарады і вёскі. За 2 сакавіка войскамі саюзнікаў узята 9.599 палонных.

У зводцы саюзнікаў гаворыцца таксама, што ад немцаў ачышчан раён каля возера Эрорт. На поўдзень ад Прумы танкавыя часці саюзнікаў пераправіліся цераз раку Німс. Саюзнікі ўтрымліваюць высату, панаючую над ракой Німс у 16 кілометрах на паўночны-захад ад Бітбурга. Танкавыя атрады саюзнікаў дасягнулі пункта зліяння рэк Кіль і Мозель, на паўночны-ўсход ад Трыра.

Пасля тыднёвага зацішша войскі саюзнікаў дабіліся некаторых поспехаў у раёне Форбаха. Далей на поўдзень саюзнікі некалькі прасунуліся на поўнач ад Бубінгена, на ўсходнім беразе ракі Саар у Германіі.

ЛОНДАН, 4 сакавіка. (ТАСС). У паведамленні штаба ўзброеных сіл саюзнікаў на міжземнаморскім тэатры ваенных дзеянняў гаворыцца, што ў Італіі ў Адрыятычным сектары часці 8 арміі занялі некалькі ўмацаваных пунктаў і захапілі палонных. Часці 5 арміі палепшылі свае пазіцыі на поўнач ад узвышша дэла Тарачыа. На астатніх участках фронта—пошукі разведчыкаў.

Адказны рэдактар
А. С. КРУШЫНСКІ.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Віцебск, вул. Валадарскага, 4. Тэлефоны: Адказнага рэдактара—0—77. Адказнага сакратара—1—02

Друкарня газеты „Віцебскі Рабочы". Тыраж 19 тыс. экз.